компонента – умственной работоспособности применялась методика Б.Бурдона в модификации В.Я.Анфимова. Важность этого компонента обусловлена тем, что одной из возможных причин возникновения и развития заболеваний является умственное переутомление студентов, которое с помощью разработанной нами автоматизированной компьютерной системы может быть вовремя замечено педагогами и ликвидировано на стадии утомления применением специально подобранных физических упражнений. Контролировать и регулировать состояние умственной работоспособности студентов может как преподаватель, так и сам студент. Для измерения уровня физического здоровья использовалась экспресс-методика Г.Л. Апанасенко.

Разработанная технология использования компьютерной мониторинговой системы «Паспорт здоровья студентов» позволяет:

1. Провести тестирование психофизического состояния студентов в различных вузах Республики Беларусь.

2. Выполнить автоматизированную обработку результатов тестирования, сформировать компьютерную базу данных с составлением различных вариантов отчета.

В заключение следует отметить, что поскольку эффективность оздоровления студентов специального учебного отделения напрямую зависит от организации их двигательного режима на учебных занятий по физическому воспитанию, использование предложенного способа контроля психофизического состояния позволит не только оценить состояние отдельных органов и систем, но выбрать наиболее эффективные двигательные режимы.

УДК 808.26-316.4

# ІНАВАЦЫІ Ў ВЫКЛАДАННІ КУРСА “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” СТУДЭНТАМ ПЕДАГАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

**Лапкоўская А.М.**
Установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Ва ўмовах разнастайных патрабаванняў, што ставіць да нас XXI, наша краіна павінна ісці стратэгічным курсам інавацыйна-тэхналагічнага развіцця ва ўсіх сферах жыццядзейнасці і грамадства, і дзяржавы. На думку многіх навукоўцаў, адной са значных сфер рэалізацыі дадзенага курса з’яўляецца сфера вышэйшай адукацыі, таму што падрыхтоўка спецыялістаў, якія могуць інавацыйна мысліць і дзейнічаць, — ключавая задача ўстойлівага інавацыйна-тэхналагічнага развіцця рэспублікі.

Кафедра лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы працуе над навукова-даследчай тэмай «Мадэлі камунікатыўна-дзейнаснага падыходу ў выкладанні лінгвістычных дысцыплін». У межах гэтай тэмы намі быў распрацаваны вучэбна-метадычны комплекс па курсе «Беларуская мова», які мае на мэце даць студэнтам навуковыя веды пра законы і з’явы сучаснай беларускай мовы, а таксама дапамагчы практычна авалодаць літаратурнымі нормамі ўжывання асноўных адзінак мовы, набыць навыкі самастойнага аналізу моўных фактаў.

Пры выкладанні курса «Беларуская мова» галоўнае месца адводзіцца фарміраванню ў студэнтаў інавацыйнага адукацыйнага патэнцыялу. Навучанне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ажыццяўляецца ў форме лекцый і практычных заняткаў, а таксама самастойнай працы студэнтаў.

Падчас лекцый выкладаюцца істотныя палажэнні вучэбнай дысцыпліны, ажыццяўляецца іх тэарэтыка-метадалагічнае абгрунтаванне, на практычных занятках паглыбляюцца і пашыраюцца веды студэнтаў па найбольш складаных і праблемных пытаннях, выпрацоўваюцца ўменні інавацыйна думаць і дзейнічаць на аснове сфарміраваных ведаў.

Асноўнымі метадамі, якія выкарыстоўваюцца у час заняткаў, з'яўляюцца: абмеркаванне вучэбных праблем, заслухванне і абмеркаванне навуковых паведамленняў і рэфератаў, дыскусійны абмен меркаваннямі па спрэчных пытаннях, выкананне розных ролевых пазіцый, правядзенне інавацыйных гульняў. Самастойная праца студэнтаў прадугледжвае больш паглыбленую іх падрыхтоўку да будучай прафесійнай дзейнасці.

Галоўны акцэнт робіцца на развіццё асобаснага творчага патэнцыялу студэнтаў, на выкарыстанне яго ў інтарэсах жыццёвага і прафесійнага самасцвярджэння.

Тэарэтычны матэрыял вучэбна-метадычнага комплекса дазваляе засвоіць асноўныя тэарэтычныя пытанні па курсе «Беларуская мова» і прымяняць у практычнай дзейнасці настаўніка пачатковых класаў. Матэрыял раздзелаў пададзены ў лаканічнай форме, у выглядзе абагульняючых схем і табліц.

Пасля кожнага блока тэарэтычнай інфармацыі размяшчаюцца заданні і практыкаванні для практычнай работы студэнтаў. Гэта матэрыял, якія дапаможа студэнтам характарызаваць разнастайныя моўныя адзінкі; умець іх аналізаваць і інтэрпрэтаваць; паказаць неабходныя навыкі і ўменні, а таксама авалодаць вуснай і пісьмовай формамі літаратурнай мовы; самастойна асэнсоўваць і тлумачыць розныя моўныя з’явы; карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці.

Апрача заданняў дыдактычнага характару выкарыстаны заданні аналітыка-творчага тыпу, якія прадугледжваюць развагі па праблеме, фармулёўку самастойных высноў, складанне табліц і схем. Прадугледжаны таксама заданні для ўдасканалення практычных навыкаў, для адпрацоўкі прапушчаных тэм, для самастойнага вывучэння некаторых тэм. У канцы кожнага раздзела размешчаны матэрыял для самаправеркі, а таксама кантрольныя працы з заданнямі рознага ўзроўню, ёсць матэрыялы для розных форм выніковага кантролю.

Пры падборы моўнага матэрыялу ўлічана скіраванасць на індывідуалізацыю навучання, прадвызначаючы і навучальны, і апераджальны характар выкарыстання матэрыялу, што дае магчымасць выкладчыкам і студэнтам вар'іраваць формы працы.

Матэрыялы, размешчаныя ў дадатку вучэбна-метадычнага комплекса, дазволяць паглыбіць веды студэнтаў пра моўныя з'явы, пазнаёміць іх з лінгвістычнай навуковай класікай.

Канцэпцыя вучэбна-метадычнага комплекса прадугледжвае фарміраванне ўяўленняў пра ўзаемасувязь моўных з’яў, прадвызначае навучальны і папераджальны характар выкарыстання матэрыялу, дае магчымасць індывідуальнага падыходу ў навучанні, дазваляе развіваць маўленне і навуковае мысленне студэнтаў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Прапануемы вучэбна-метадычны комплекс з'яўляецца сродкам арганізацыі індывідуальнай траекторыі навучання па курсе «Беларуская мова» для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей.

Улічваючы, што якасць засваення студэнтамі неабходнага для вывучэння матэрыялу, засвоенага імі вопыту і, такім чынам, дзейнасці, якую яны могуць здзяйсняць у выніку навучання, характарызуецца рознымі ўзроўнямі засваення (дзейнасці), то ацэньванне студэнтаў па курсе праводзіцца на аснове вучэбна-метадычнага комплекса на розных узроўнях: **1 ўзровень** — узровень уяўлення (знаёмства). Студэнт здольны пазнаваць аб'екты і працэсы, калі яны пададзены яму самі або дадзена іх апісанне, малюнак. На гэтым узроўні студэнт валодае веданнем-знаёмствам і здольны пазнаць, адрозніць і суаднесці аб'екты і працэсы; **2 ўзровень** — узровень аднаўлення. Студэнт можа прайграць інфармацыю, аперацыі, дзеянні, рашыць тыпавыя задачы, разгледжаныя пры навучанні. Ён валодае веданнем-копіяй; **3 ўзровень** — узровень уменняў і навыкаў. Студэнт умее выконваць дзеянні, агульная методыка і паслядоўнасць якіх вывучаны на занятках, але змест і ўмовы выканання іх новыя; **4 ўзровень** — узровень творчасці. Студэнт не толькі авалодвае ведамі, уменнямі і навыкамі, але і ўмее самастойна «здабываць» неабходныя веды і ўменні.

Такім чынам, пры выкладанні курса «Беларуская мова» на аснове распрацаванага вучэбна-метадычнага комплекса выкарыстоўваюцца наступныя інавацыйныя метады і прыёмы: а) правядзенне інтэрактыўных лекцый, а менавіта выкарыстанне метаду «пытанне-адказ» у час працы са студэнтамі; правядзенне кароткіх прэзентацый, падрыхтаваных студэнтамі, якія раскрываюць тое ці іншае пытанне, сфармуляванае ў тэме; тэставанне; б) укараненне на практычных занятках такіх форм працы як «круглы стол», «майстэрня», дзе студэнты, абмяркоўваючы, вырашаюць цікавыя, іншы раз нават даволі складаныя, моўныя факты на аснове ўласных самастойных напрацовак; в) пераўтварэнне самастойнай працы студэнта, выкананне індывідуальнага навукова-даследчага задання (напісанне курсавых і дыпломных работ); г) выкарыстанне на занятках прэзентацый, публікацый, падрыхтаваных студэнтамі ў адпаведнасці з навукова-даследчай тэмай; д) шырокае выкарыстанне мультымедыйных сродкаў у час чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў, электронных і розных відаў апорных канспектаў лекцый і іншага дадатковага матэрыялу па дысцыпліне, якія пададзены на сеткавай адукацыйнай платформе ГрДУ ім.Янкі Купалы (edu.grsu.by); е) выкарыстанне новых падыходаў да кантролю і ацэньвання дасягненняў студэнтаў.

УДК 378.015.3

## СУБЪЕКТНОСТЬ СТУДЕНТОВ ВУЗОВ В УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ КАК ФАКТОР УСПЕШНОСТИ ОБУЧЕНИЯ

**Ларионова Н.О.**
УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»
г. Гродно, Республика Беларусь

В современном обществе происходит стремительное накопление социокультурного опыта. Проблема подготовки в вузе грамотного и компетентного специалиста становится все более актуальной в настоящее время. Трансформируются цели и содержание образования, происходит



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ